Нядзеля 11 Сьнежня 1921 г.

БЕЛАРУСКІ ГОЛАС

АДНАДНЕЎКА

Адрес Рэдакцii i Адмiнiстрацii
Біскупская 12

Цана нумару 30 мк.

Biełaruski hołas.

Wybarnaja rabota pačałasia. Ale pačałasia jana ŭ takich warunkach, pry katorych nam, biełarusam, wielmi trudna wyskazać wolna i adkryta našy dumki i pahlady: polskaja ŭłada „Siaredniaje Litwy“, suproć usich abiacanak, nie daje ni swabody słowa i druku, ni swabody ahitacyi... Biełaruskija niezaležnyja časopisi pazačyniany, na nowyja nie dajuć dazwołu, a pad toj čas wolna raźwiwajecca lakajskaja alaksiukoŭskaja presa! Nadrukawany nižej dakument jasna pakazwaje, chto zapraŭdy kiruje rukoj Alaksiuka i ŭsiaje jahonaje cheŭry, chto šyryć jahonu,u „Jednaść“!..

Pry takich umowach patrebien wolny i niezaležny hołas biełaruski, jaki my, nia majučy dazwołu wydawać hazetu, padajom u našaj adnadnioŭcy.

Wiedama, hołas naš u pieršy čarod budzie ab wybarach u ładžany palakami Wilenski Sojm.

Biełaruski Nacyjanalny Kamitet u Wilni padaŭ swoj hołas ab ich, a heta — hołas usiaho arhanizawanaha biełaruskaha hramadzianstwa, ŭsich biełarusaŭ, jakija nie pradali swajho sumleńnia i, nie bajučysia kar i pieraśledawańnia, skazali jasna i adkryta słowa praŭdy.

My-ž pahladzimo, dziela čaho sklikajecca Sojm pry takich nienarmalnych warunkach i na što jon tak patrebien palakom.

Wiadoma, što ŭwieś świet u asobie Lihi Narodaŭ užo zrabiŭ swaju pastanowu ab Wilenščynie. Pastanowa heta kaža, što Wilenščyna, jak asobnaja samaŭpraŭnaja adzinka (kanton) pawinna być złučana z takoj-ža samaŭpraŭnaj Kowienskaj adzinkaj u adno haspadarstwa — z tym, što kožyn z hetych dwuch kantonaŭ budzie sam sabie haspadarom. Wiedama, pry takoj razwiazcy Wilenskaha pytańnia ŭ Wilenskim kantonie ŭziali b wierch biełarusy: tut naša ličebnaja pierawaha, dyj tyja tysiačy polskich nawaznych čynoŭnikaŭ, jakim ciapier dajecca prawa hołasu na wybarach, choć jany nia tutejšyja—čužyncy, prymušany byli-b wiarnucca damoŭki — da Polščy. Woś, dziela hetaha polskaja ŭłada „Siaredniaj Litwy“ dy tak sama i polski ŭrad u Waršawie ni za što nia chočuć paddacca pastanowie Lihi Narodaŭ . Ich meta — prosta dałučyć Wilenščynu da Polščy, pazbawiŭšy nas usialakaha samaŭpraŭleńnia, a tady našy pasły ŭ Waršaŭskim Sojmie zusim nia mieli by siły suproć wializarnaje masy palakoŭ. Tady, wiedama, i ŭsia naša haspadarka astałasia-b u polskich rukach, i polskija pany, jakija ciapier siadziać na „siarednia litoŭskich“ uradach, zachawali-by na wieki wiečnyja ŭładu nad Biełaruskim Narodam.

Woś dziela čaho sklikajecca Wilenski Sojm, u jaki, dziakujučy dobraj „padhatoŭcy“, dziakujučy začyniańniu wustaŭ biełarusam i pałochańniu našaha sialanstwa ŭsialakimi karami — na hetym i na tym świecie, zapraŭdnyja zastupniki biełaruskaha narodu nia buduć dapuščany.

Woś, dziela čaho puscajecca ŭ chod Alaksiuk z jaho „Jednaściu», Alaksiuk, jaki oficjalna abwieściŭ užo, što jon i jaho cheŭra buduć „barocca za łučnaść hetaje ziamli z Polščaj».

Barocca—ale z kim? Adkaz jasny: z usim biełaruskim hramadzianstwam, jakoje choča niezaležnaści swajej Baćkaŭščyny, barocca z biełaruskim sialanstwam, jakoje nia choča bolš być pakornymi słužkami polskich panoŭ-abšarnikaŭ, barocca ŭrešci z usim świetam, jaki ŭ asobie Lihi Narodaŭ zabiaspiečywaje našaj Baćkaŭščynie kali nia poŭnuju niezaležnaść, dyk prynamsi kantonalnuju aŭtanomiju, poŭnaje samaŭpraŭleńnie ŭ mietach našaje ziamli.

Niachaj-ža rasčyniacca wočy ŭsiaho biełaruskaha sialanstwa, niachaj, nia hledziačy na trochhadowyja polskija bałamuctwy, narod naš zrazumieje, chto za što zmahajecca, chto kamu słužyć. Niachaj zrazumieŭšy tuju palityku, jakaja kirujecca da poŭnaha paniawoleńnia biełaruskich pracoŭnych mas polskim panstwam, narod naš dašć naležny adpor usim, chto pasiahaje na našu wolu, našaje ščaście, naš nacyjanalny byt!

Starostwo
Powiatu Wileńskiego
Dnia 21. 5.—1921r.
№ K. pf. L. 90/Sek.

Odpis
Scisle Poufne

Do Pana Komendanta Policji Państwowej
Pow. Wileńskiego.

Rozpoczęto wydawnictwo tygodnika p. t. „Jedność“ drukowanego w języku białoruskim czcionkami łacińskiemi. Zawiadamiam Pana, że pismo to występuje pod hasłom łączności z Polską i dla tego nie należy utrudniać i powstrzymywać kolpoltarzu tygodnika na terenie Litwy Srodkowej, owszem wpływać tam gdzie już jest ludność białoruska na rozwój czytelnictwa.

(—) Rozen
Starosta pow. Wileńskiego

Za zgodnoś (—) K. Abraniowiczowa.
wz. Sekretarza

(—) nieczytelny
Sekretarz

ПАСТАНОВА

Беларускага Нацыянальнага Камітэту.

ПРЫМАЮЧЫ ПАД УВАГУ:

1) што Заходня-Беларускія землі, якія адыйшлі ад Расеі, штучна падзелены на часткі паміж „Сярэдняй Літвой“ і Польскай Рэчпосполітай,

2) што ў спорцы паміж Польскай і Літоўскай Рэспублікамі аб тэрыторыю „Сярэдняй Літвы“ у межах каторае беларусы становяць бязумоўную большасьць, голас Беларускага Народу і яго інгарэсы зусім ня прымаюцца пад увагу,

3) што зьбіраны цяпер Сойм „Сярэдняй Літвы“ мае пастанаўляць аб долі толькі аднае часткі Заходняе Беларусі — пад той час, як другая зусім пазбаўлена права самастанаўленьня,

4) што ня гледзячы на разнароднасьць насяленьня „Сярэдняе Літвы“ і спорнасьць яе тэрыторыі, уся ўлада знаходзіцца выключна у руках аднэй нацыянальнасьці—польскай, у значнай меры, навет не ў руках грамадзян краю,

5) што функцыі і характар Сойму офіцыяльна не устаноўлены, а факт скліканьня яго пры аднастароньнай уладзе не дае пэўнасьці, што проэктаваны Сойм будзе запраўдным выяўленьнем волі краю,

6) што ў працягу блізка трох гадоў усімі спосабамі, дастунными дзяржаўнай уладае, праводзілася на зямлі Беларускай палітыка нацыянальнага уціску беларусаў, зачынялися беларускія школы, газэты, эканамічныя організацыі і нішчылася ўсялякая праца над культурным і эканамічным разьвіцьцём Беларускага Народу,

7) што, пасьля такой трохгадовай палітыкі, цяпер, пры кароткім 30-дзённым выборчым пэрыадзе, дэзорганізованае і дэзорыентованае беларускае насяленьне ня здолее сьвядома і свабодна выявіць свае думкі і жаданьні — тым больш, што навет і на час выбараў не абвешчаны адпаведныя гарантыі свабоды; што і далей уладаю вядзецца палітыка закрываньня беларускіх школ, зачыненьня і забароны незалежнае беларускае прэсы і г. д,

8) што пры такіх варунках вольнае і сьвядомае выяўленьне волі насяленьня нашага краю дарогай выбараў у праектаваны Сойм немагчыма,—

БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАМІТЭТ гэтым заяўляе, што запраўднае выпаўненьне волі народу ў Віленскім Сойме, які здаўна выпісаны, як палітычны кліч, на штандарах усяе краёвае дэмакратыі, магчыма толькі пры ўчасьці ў упраўленьні краем усіх яго нацыянальнасьцей на парытэтных асновах, пры фактычным забяспечаньні грамадзкае і нацыянальнае свабоды у працягу даўжэйшага часу і пры пашырэньні выбараў у Віленскі Сойм на ўсе Беларускія землі, якія адыйшлі ад Расеі. Толькі пры такіх умовах, магчыма так патрэбнае аб'яднаньне ўсіх нацыянальнасьцей краю на грунце творнае дзяржаўнае працы і правільнага выяўленьня волі ўсяго насяленьня.

Вільня, 10. XII. 1921.

Alaksiuk.

Pišučy hetyja słowy, wam, siarmiažnyja Braty, sialanie našy rodnyja, majem skazać šmat čaho cikaŭnaha.

Chto taki Alaksiuk?

Alaksiuk heta biełaruski zdradnik, adstupnik i wyradak. Jon wyraksia biełasusaŭ i pradaŭ za polskija marki naš sialanski lud.

Praŭda, Alaksiuk zawie siabie biełarusam i was sialanie siańnia paklikaŭ na zjezd byccam biełaruski i pryšle da Was na wioski swaich najmitaŭ-brachunoŭ tak sama byccam biełarusaŭ i ščyrych Wašych pryjacielaŭ. Ale ŭsio heta falš i ašukanstwa. Alaksiuk tak robić, bo heta patrebna polskim panom ,jakim jon pradaŭsia z dušoj i z ciełam.

Ciapier pany robiać sojm u Wilni. Hety sojm im patrebny, kab, uziaŭšy u swaje abaroty sialan biełarnsaŭ adniać ad ich ziamlu, i addać jaje polskim žaŭnieram, a najchutčej pakinuć sabie i zajawić Lizie Narodaŭ, što heta ŭsio zroblena dabrawolna, što sialanie sami chacieli iści na sojm, hałasawali i na ŭsio zhadzilisia.

Ale tak chitra zrabić nialohka; dziela hetaha treba ašukać, abo kupić samych-ža biełarnsaŭ kab wyšła tak, što jany sami siabie pradajuć. Dyk wotža pany dla hetaj podłaj raboty kupili Alaksiuka, kab jon im dapamoh. Alaksiuk zhodziŭsia, bo jon na ŭsio hodzicca, za što jamu dajuć hrošy. A hrošy jon lubić nia tolki brać, jak dajuć, ale lubić i ŭkraści.

Alaksiuk, jaki słužyŭ u wajskowaj biełaruskaj kamisii, dyk ukraŭ niešta bo'ś jak paŭmiljona marak. A kali niadaŭna u Wilni adna hazeta napisała, što Alaksiuk złodziej, dyk jon dla wielu nie ŭspadabaŭ i padaŭ redaktara u sud, dumajučy što jaho pany padtrymajuć i jon astaniecca čystym. Tymčasam stałasia inakš. Redaktar toj zdabyŭ dakumenty, z jakich jasna widać, što Alaksiuk złodziej. Tady pany, žadajučy mieć sabie Alaksiuka na wybary u sojm, zrabili tak, što sud adłažyli, bo jany wiedajuć, što sud jaho pasadzie u turmu, a brać z turmy złodzieja, kab jon sklikaŭ biełarusaŭ u sojm, — nadta brydka. Dyk woś pany pastaralisia kab sud adłažyć da lepšaha času. A tymčasam Alaksiuk zajmajecca danosami na biełaruskich dziejačoŭ, praŭdziwych pryjacieloŭ sialanskaha ludu, kab siabie wypchnuć na pieršaje miejsca i razam z panami zapanawać nad harotnym biełarusam.

Dyk, Braty sialanie, niachaj Was Boh ścieraže kab Wy pašli za Alaksiukom, pasłuchali jaho hołasu i darma pradali panom siabie, swaich bratoŭ harotnych i swaju rodnuju ziamielku krywioj i potam wašym palituju.

Dawoli nam panskaj niawoli, dawoli niadoli i hora! Proč panoŭ i ichnych pradažnych prychwostnikoŭ-złodziejaŭ Alaksiukoŭ Proč zdradnikaŭ i wyradkaŭ biełaruskich!

Niachaj žywie sialanski pracoŭny lud biełaruski, polski i litoŭski, i jahonaja pracoŭnaja intelihencija!..

D.

ЮДАМ.

Да вас, паны, што голасна крычыце
Аб прыязьні свaей да „беднага народу“,
Што раіце па лісьсяму: „маўчыце,
Надоўга вам дамо багацтва, волю, згоду“,—
Да вас мой гэты верш і словы ўсе благія,
Бо словам вы адны, а справамі—другія.
„Багацтва вам“.. Няма вам нашай веры!
Бо ў той-жа год ліхі, як ў полі неўрадзіла,
Галоднаму на прокорм хлеба меры
Аднэй ня далі вы. І злаялі няміла...
Калі для нас жадаеце багатцтва,
На што з бяздольнага зьдзіраеце апратку?
На што-ж тагды вы плодзіце жабрацтва,
Дамы пустошыце бяз ліку, без астатку?
„Мы волю вам“... Праклінцьце вам і з ёю!
Чаму ад волі вашай мы стагнаць павінны?
Яна ланцуг над нашаю зямлёю
Астрог на наш народ спакойны і бязвінны.
Ня воля гэта! Што нам ні зьвядзіце,
Мы вольнымі былі задаўнымі часамі.
Ідзіце-ж проч! і з воляю ідзіце!
Да волі знанае хутчэй мы прыдзем самі.
«Мы згоду вам»... Пакіньце ашуканства!
Вы бойкі братняе чарнейшыя прарокі,
Бяз звады вам, нашэптаў, падтыканства,
Нямілы Божы сьвет, ні ясны, ні шырокі.
Ня просім вас! ня трэба вашай згоды!
Свае вялікае, дзядоўскае багацьце
Хаваем мы; ад Бога ўсе народы
У бацькі аднаго ўсе дзеці—людзі, брацьця.
Адкуль вы к нам? Чыйго плямя і роду?
З якіх краёў прыйшлі бяз праўды і бяз сэрца?
І што вам з нас, ад нашага народу?
Чаму так жычыце яму хутчэй памерці?
Га! знаем вас, атручэньня найміты:
Вы—служкі чорныя Ясьнейшага Мамону,
Вы—мора бруд ля берагу намыты;
Бяз дум і без мазгоў, вы—золата бяз звону.
Зусіх вякоў на послугі уціску
Чаргою воўчаю зьяўляецесь усюды,
Дзе прымуць вас для крыўды, для націску
На праўду вечную... Вы... вы... імя вам: Юды!
Ідзіце-ж проч! Безплодна ваша трата
На ласкі лісьсія. Пакіньце слова „брат“!
Вы цяжкі сон. Каты... Вы горай ката!
Кругом праклятыя, вам бацька, брат—дукат!

(„Матчын Дар“, 1918).

Алесь Гарун.

Перадвыбарны ход.

Тыя, хто супроць пастановы ўсяе Эўропы зьбіраюцца склікаць у Вільні Сойм, у якім наперад забясьпечана панаваньне аднэй толькі нацыянальнасьці (якімі спосабамі — аб гэтым усім добра вядома!) — тыя ўсё-ж такі маюць неспакойнае сумленьне: а мо ткі праскочаць туды якія беларусы (бо-ж народ тутака, ня гледзячы на ўсе „статыстыкі“, беларускі)?! Тым балей, што беларусы ёсьць розныя: адна частка, як вядома, пьвёрда выступае проці прылучэньня Віленшчыны й Гарадзеншчыны да Польшчы і ні аб якой угодзе з палякамі гаварыць ня хоча; другая, наадварот, верыць у шчырасьць польскай дэмакратыі й яшчэ ня згубіла да канца надзеі на не. Ведама, аб першай няма што й казаць, што яна будзе праводзіць бойкот выбараў у Сойм. Другая-ж яшчэ афіцыяльна ня выказала сваей думкі.

Вось, арганізатары выбараў і ўбаяліся: а мо тыя беларусы якія не зракліся яшчэ йгры з Польшчай, возьмуць ды й пойдуць на выбары? А мо іх паслы заявяць з соймавай трыбуны аб тым, што гэты кусок зямлі, аб якім ідзе спорка між Польшчай і Літвой, ёсьць зямля Беларуская?! І страх узяў гэтых паноў. Пачалі варушыцца, каб да гэтага не дапусьціць.

Работу цавялі ў двух кірунках.

Перш-на-перш выпусьцілі з вастрогу чалавека (на жаль, запраўды беларуса па крыві), які сядзеў тамака за звычайнае злодзейства: украў, бачыце, 681,500 марак! Ды ня толькі дарасалі яму злачынства, але й далі багата грошы на „работу“, „скупляць“ беларускія душы, галодных, безработных людзей, каб з іх падмогай правясьці ў Сойм ад беларусаў паслоў, якія не задумываючыся прададуць свой народ і сваю Бацькаўшчыну.

Адначасна пачалася работа, каб апляваць, зьняславіць тых запраўдных беларускіх дзеячоў, якія верылі ў польскую шчырасьць і прыхільнасьць: іх, бач, у вастрог не пасадзіш, як можна зрабіць з бойкотыстамі! А як гэтыя дзеячы гуртаваліся ў Віленскім Саюзе Коопэратываў, дык падасланыя агенты, звольненыя з войска нейкім **тайным** прыказам, сфабрыкавалі судовае дзела, кідаючы на гэных паважаных, шчырых і чыстых дзеячоў ўсялякую ганьбу. Да гэтай нягоднай змовы далучылася рэдакцыя газэты польскае дэмакратыі „Gazeta Krajowa“, рэдактар каторай, вялікі абшарнік Людвік Хомінскі (так сама ў „дэмакраты“ перафарбаваўся!) аддаў сваю часопісь да ўжытку гэных падасланых агентаў. Згода паміж імі была такая што агентам-правакатарам дазволена было друкаваць усё, што ім хочацца, без прагляду рэдактара (сам ён у гэтым прызнаўся ў сваей газэце!).

Як бачым, перадвыбарны ход вельмі дасьціпны. Нам-жа здаецца, што якраз гэты ход павінен расчыніць вочы тым нашым беларусам, якія нечага спадзяваліся ад Сойму, — павінен паказаць усім, што і самае скліканьне Сойму ёсьць толькі палітычны крок, які мае адну мэту: **„да Польшчы“!**

„Свабода“ навучаньня.

Ніжэй мы даем жменю прыгавораў і просьб беларускага сялянства аб беларускія школы.

Ніводная з гэтых просьб польскай уладай не здаволена. А гэта—толькі малая частка такіх дарэмных просьб аб школу ў роднай мове....

Вось, як выглядае „воля“ для беларусаў!

Копія.

Do Pana Inspektora Szkolnego w Wołożynie.
Mieszkańców wsi Sowłowa, gm. Połoczanskiej, pow. Wołożyńskiego.

Podanie.

Niniejszym mamy honor prosić Pana Inspektora szkolnego dozwolić istnieniu szkoły powszechnej białoruskiej we wsi Sowłowo, gm. Połoczańskiej, pow Wołożynskiego. My jestemi białorusiny i chcąc uczyć dzieci swoje w języku białoruskim, a język polski wykładać, jak przedmiot. Prosimy Pana Inspektora o zaliczenie nauczycielem w tej szkole Dworeckiego Niczypora Podpisy: niepiśmienne: Іван Кавалевіч, Язэп Кавалевіч, Міхась Грыб, Максім Кавалевіч, Андрэй Кавалевіч, Сымон Грыб, Адам Кавалевіч, Сьцяпан Грыб, Алесь Кавалевіч, Васіль Кавалевіч, Міхась Аноп, Іван Аноп, Піліп Кавалевіч, Сьцепан Кавалевіч, Ігнат Кавалевіч, Андрэй Кісліцкі, Мікола Кісліцкі, Юстын Кісліцкі, a za ich niepiśmiennych i za siebie podpsaliśmy się: Сьцяпан Кавалевіч, Іван Кавалевіч, Бенэдыкт Споцька.

Копія

Do Pana Kuratora Szkolnego Okręgu Nowogródzkiego.
Mieszkakańców wsi Czertowicze gminy Wołożyńskiej i powiatu.

Podanie.

My niżejpodpisani mieszkańcy wsi Czertowice Wołożyńskiej gminy i powiatu uprzejmie prosimy Pana Kuratora o zatwierdzenie naszej białoruskiej powszechnej szkoły, która była u nas i zeszłego roku. Szkoła ta będzie się mieścić w prywatnym budynku Nikifora Bociana. Kiedy niema na to dozwolenia, żeby nasza szkoła była urzędową, to my będziemy utrzymywać szkołę i nauczyciela sami. Nauczycielem prosimy mianować Suchodolca Włodzimierza, który u nas pracował i w zeszłym roku. Przy tym meldujemy, że my zwracaliśmy się z niniejszą prośbą do Pana Inspektora szkolnego powiatu Wołożynskiego, który powiedział nam zwróbić się do Pana Inspektora.

Z oryginałem zgodność stwierdzam sołtys wsi Przestowicza (Янка Богдан) dnia 24 XI 1921 roku.

Копія.

Пану Школьнаму Інспэктару Вялейскага павету

Гаспадароў вескі Вяжуці, Лебядзеўскае вол. Вялейскага павету.

Заява.

Мы ніжэйпадпісаныя гаспадары вёскі Вяжуці, зварочаемся да пана інспэктара з просьбай, каб у нас як і летась, была беларуская школа, навукі каб выкладаліся у нашай роднай беларускай мове з дадаткамі польскай мовы, як прадмета, вучыцелькай каб засталася Аўдоля Шыман, якая вучыла у нас у мінулым навуковым годзе. Подпісы: Андрэй Бобрык, Вікентій Мялюк, Міхал Савіцкі, Раман Андзіловіч, Леонтій Пуларевіч, Семе Мялюк, Петр Осімовіч, Васіль Бобрік, Міхаіл Осіповіч, Екатеріна Осіповіч, Яков Андзіловіч, Петр Андзіловіч. Няпісьменныя: Тэкля Мялюк, Ляксандра Мялюк, Стэфка Тышкевіч, Юрка Мялюк, а за іх распісалася Ольга Осіповіч.

Własnoręczność podpisów stwierdzam 12|IX—21 Wojt Lebiedziewskiej gminy (—) Sekretarz (—) (sztempel).

Odpis.

Do Pana Inspektera Szkolnego w Wilejce!

Mieszkancôw wsi Kołodczyno i Krinica gm. Wiarynskiej.

Podanie.

My niżej podpisani mieszkancy wsi Kołodczyno i Krynicy uprzejmie prosimy p. Inspektora Szkolnego odkryciu uruchomienia w naszej wsi początkowej szkoły białoruskiej. Jestemi białorusinami chcemi uczyć dzieci w języku ojczystym białoruskim, polski język jako żądowy będzie wykładowy w szkole. Na stanowisko nauczyciela prosimy zatwierdzić Jana Wikmirskiego z Kasucka, ktury język polski posiada dobrze. Ta szkoła prosimy przyjąć na koszt rządowy.

Podpisy: (—) P. Nazejko, (—) A. Nozejko, (—) A Bohdan, (— J. Fastowicz, (—) Петр Норшко, (—) К. Bagdan, (—) Андрэй Сошоно (—) Н. Латутко, (—) Янка Гаўрын, (—) Александр Судінковіч, (—) Θеодосій Гамалка, (—) П. Гачалка, (—) Н. Опкуда, (—) Ніколай Орімя, (—) Марія, (—) А. Сонін, (—) Міхеіч, (—) Сонін, (—)М. Соніч. niepiśmienny Jan Łakutko, (—) Filip Sudnikowicz (—) Mikołaj Łakutko, (—) Alaksandryna Hawrylik, (—) Olga Humołko, (—) Grzegorz Filistowicz, (—) Justyn Bohdan, (—) Amiljan Łaszrutko, (—) Jan, (—) Stefan Łaszutko, (—) Łukasz Sonicz, (—) Onufry Szuszkiewicz, (—) Grzegorz (—) Bazyta Filistowicz, za niepiśmiennych na skutek prośby podpisał Jan Gawryluk. Własnoręczne podpisy wyżej wymienionych osób stwierdzam gmino Wiarynka. Wôjt gminy (—) nieczytelny.

Копія.

Прыгавар

Гедзальскай сельскай грамады.

30 наября 1921 году. Мы ніжай падпісаныя сяляне вескі Гедзялі, Лідцкага павету, Бяліцкай воласьці, собраўшыся на сход паміж іншым абгаварывалі справу адчыненьня для нашай вёскі школы. Аднагалосна прыгаварылі.

1 лічыць патрэбным адчыненьне пачатковай школы

2 школа павінна быць беларускай з выкладаньнем польскай і расейскай моваў як прадметаў.

3 прасіць Беларускую Школьную Раду у Вільні назначыць вам вучыцелем сьвядомага беларуса Юзіка Хрыштановіча, каторы вучыў 1920-21 годзе у Вусьцяноўскай беларускай пачатковай школе, Слонімскага павету.

У чым расьпісываэмся за сябе і за неграматных па іх лічнай просьбе: за Янука Смольскага, Г. Хріштановіча, А. Бабанскага, М. Яварэц, А. Харошка, К. Хрыштановіча, Г. Падрочу, М. Будзевіча, А. Станкевіча, К. Крыштана, Г. Ярашэвіча, А. Хрыштановіча, С. Хрыштановіча, Ю. Яновіча, А. Горкага, А. Косага, М. Коску, М. Бурдына, З. Пухоўскую, К. Яварэц, Ю. Рудзевіч. Ю. Ярашевіч, М. Балабанскую, Т. Самолінка, У. Пышку, К. Хрыштановіча па іх лічнай просьбе сваяручна расьпісался: Іван Смольскі, Агорі Хрыштарновіч, Я. Хрыштановіч, В. Хрыштановіч, А. Хыштановіч, В. Подраба, У. Хрыштановіч, П. Руднік, К. Хрыштановіч, Серада Хрыштановіч, Іван Семашка, Іван Пухоўскі, Мікола Падруба, Агорі Хрыштановіч, Горкач, Т. Самоленко.

ХРОНІКА.

Вольная агітацыя пачынаецца.

ЗАЛЕСЬСЕ, Беніцкай гміны Ашмянскага павету.

9 сьнежня г. г. у нашу воласьць рапгоўна, кажуць, што з Вільні, прыехаў атрад паліцыі, лікам каля 30 чалавек. Чаго і зачым прыехалі, ніхто ня ведаў і цяпер ня ведаем. Знаем толькі добра, што ў Залесьсі, Ардзеі, Аленцы, Вётахаве і іншых вёсках зрабілі шчыльные вобыскі, навет у кублы заглядывалі потым арыштавалі каля 30, а можа і балей нашых аднасельчан, панастаўлялі ім сінякоў і гузоў і адправілі ў Ашмяну. Сярод арыштаваных знаходзіцца сялянін Русак, калека, якому 80 гадоў; і моцна зьбіты вучыцель пачатковае беларускае школы ў Вётахаве Янка Дудка. Злыя языкі кажуць, што гэта ад таго, што нашы сяляне ня хочуць выбіраць у панскі сойм. І праўда, хто ж адважыцца выбіраць у сойм пры такой „вольнай“ агітацыі? Калі цяпер нас б'юць, то што-ж будуць рабіць з намі, калі зьбяруць Сойм?

Выбаршчык.

Выбары у Сойм і „інародцы.“

Як мы даведаліся, ўсе краёвыя нацыянальнасьці, апрача адных толькі палякоў, пастанавілі устрымацца ад учасьця у выбарах у Віленскі Сойм, лічучы, што сучасныя варункі не забясьпечываюць свабоды выбараў, дый правы і мэты Сойму не адпавядаюць вымогам беларусаў, літвіноў, жыдоў і другіх.

Суд у справе Аляксюка.

Як вядома, віленская часопісь „Віленское Слово“ ў сваім часе была напісала пра Аляксюка нешта кшталтам кражы грамадзкіх грошы, за што Аляксюк быў пасаджаны ў вастрог. За гэта Аляксюк падаў на рэдактара гэтае часопісі, Мэйтіна, у суд. Справа павінна была разглядацца ў мінулую пятніцу, 9 сьнежня. Аднак пазваны на суд рэдактар здалеў сабраць усе патрэбныя дакумэнты аб злачынстве Аляксюка, і апошні, відаць баючыся, каб вынік справы не пашкодзіў яму на выбарах у Сойм, прасіў суд дзела адлажыць. Яно мае разглядацца толькі пасьля выбараў — прыблізна ў месяцу лютым.

Дзеля яснасьці, аб што йдзе справа, мы друкуем тутака дакумэнт, з якога відаць істоту праступку Аляксюка:

Да Паўнамоцнага Мужа
Беларускіх Грамадзкіх Установ
п. Вацлава Іваноўскага.

„Гэтым-то лістом азнаймуем Вам, што быўшы Старшыня Прэзыдыюму Беларускае Вайсковае Камісіі п. Павал Аляксюк у пачатку чэрвеня г.г. перадаў у касу Б. В. К. трыста тысяч марак, заявіўшы, што толькі гэту суму ён атрымаў з М. С. В. („Міністэрства Спраў Вайсковых“—Рэд.) і спэцыяльна на выпадак эвакуацыі Б. В. К. („з Менску перад прыходам бальшавікоў“—Рэд.).

„Паводле выпісу з кніг Гаспадарчага Дэпартаманту М. С. В. учора 26 г. ліпеня выясьнілася, што 26 мая г.г. для Б. В. К. на рукі п. Аляксюка было выдана 981.500 м.

„Такім парадкам п. Аляксюк ня здаў у касу Б. В. К 681.500 м.

„Даводзячы аб гэтым да Вашага ведама, просімо прыняць належныя крокі.

„Адначасна аб гэтым прэзыдыюм Б. В. К. паведамляе Польскія Вышэйшыя Улады“.

27.VII. 1920 г. м. Варшава.

Сябры Прэзыдыюму Б. В. К.:
(—) Антон Аўсянік. (—) А. Якубецкі.

АДКЛАД НЯ ЙДЗЕ У ЛАД! Генэрал Жэлігоўскі, які меўся выехаць з Вільні на час выбараў у Сойм, каб паказаць Лізе Народаў, што ён ня хоча рабіць націску на ход выбараў, — захварэў і выехаў толькі ў сваю прыватную кватэру на Зьвярынцы.

З гэтае прычыны ён яшчэ на нейкі час астанецца ў Вільні.

БЯЗПРАЎНЫЯ КАНФІСКАЦЫІ. Улада ізноў канфіскуе аднадзеўкі ў польскай мове, якія выходзяць згодна з законамі аб друку, але пішуць у прыхільным да Літвы духу.

БЕЛАРУСКІ ВЕЧАР. Сягоньня, ў нядзелю 11 сьнежня, ў салі Беларускае Гімназіі (Вострабрамская 9) адбудзецца беларускі вечар. На сцэне ставіцца „Хлопчык у лесе“, пасьля хор і дэклямацыя.

Увесь даход пойдзе на карысьць прытулку для бедных беларускіх дзяцей ў Вільні.

Роста трыумфуючы паведамляе, што ў брашуры, выданай паслом польскага Сойму Заморскім, ёсьць сэнсацыйныя весткі, быццам Пілсудскі і Дашынскі мелі ў свой час зносіны з Вільгэльмам і Францішкам-Юзафам. Адначасна „Правда“ зьмяшчае паведамленьне, што у паразуменьні з Пятлюраю, Савінкавым і Дашынскім, Пілсудскі апрацаваў новый плян вайны з бальшавікамі. „Праўда“ мае надзею, што Савецкі Урад дасьць на гэта належны адказ.

Варшаўскія дыпляматычныя кругі атрымалі вестку што Чэхо-Славацкі урад згадзіўся на высяленьне за межы рэспублікі Савінкава і яго агентаў.

Рэдактар-Выдавец Ул. Міхалевіч.

Друкарня „ДРУК“, Субач, 2.